

# Сцяпан Захаркевіч

гісторык, этнолаг. Кандыдат гістарычных навук, дацэнт Акадэмічнага дэпартамента гуманітарных навук і мастацтваў ЕГУ. Навуковыя інтарэсы: традыцыйная і сучасная культура Беларусі, яе эвалюцыя і трансфармацыя; гісторыя і культура этнічных меншасцей Беларусі.

Фота Ганны Голуб

# Традыцыйная культура беларусаў: удалы праект культурнай спадчыны Беларусі, інструменталізаваны этнаграфіяй

## Traditional culture of Belarusians A successful project of cultural heritage of Belarus instrumentalized by ethnographys

**Сцяпан Захаркевіч**

**The article by EHU Associate Professor Stsiapan Zakharkevich is devoted to the process of establishing the concept of "Belarusian traditional culture" as an element of the cultural heritage of Belarus. Using a broad historical background, the author shows the emergence, development and consolidation of the idea of traditional culture as a fundamental element of the Belarusian national project. Academicians, intellectuals, and heroes of popular culture, as well as politicians and civic activists, took a direct and effective part in this. Thus, the article opens a discussion about the nature of the Belarusian culture and the place of the ethnographic component in it.**

*У пошуках нацыянальнай ідэнтычнасці і месца беларусаў у свеце мы часцей звяртаемся да свайго аўтэнтычнага мінулага, звязанага з фальклорам, этнаграфіяй, укладам, апелюючы да былой велічы, нярэдка пераацэненай ці непадзеленай з бліжэйшымі суседзямі. Такія адзнакі часта бываюць суб'ектыўнымі і спрэчнымі.*

*Дз. Сурскі,*
*Залатая калекцыя беларускага плаката*

Тэма артыкула настолькі абшырная, што патрабуе апісання праблемы шырокімі мазкамі. Тым не менш, такі падыход эфектыўны, калі трэба ўбачыць агульную карціну працэса. Чаму размова пойдзе менавіта аб традыцыйнай культуры? Традыцыйная культура беларусаў як сукупнасць матэрыяльных, духоўных і сацыяльных элементаў вясковай культуры Беларусі у канцы XX – пачатку XXI стагоддзя з'яўляецца неад'емнай і вельмі важ-

най часткай культурнай спадчыны Беларусі, а таксама падмуркам нацыянальнага вобраза беларусаў. Вобраза, які добра ўсведамляецца, стэрэатыпна ўспрымаецца, адразу візуалізуецца і рэпрэзентуецца і самімі беларусамі, і знешнімі назіральнікамі.

У гэтым артыкуле я паспрабую прааналізаваць і паказаць працэс стварэння і развіцця канцэпту «традыцыйнай беларускай культуры» як аднаго з важных элементаў сучасных уяўленняў беларусаў аб культурнай спадчыне Беларусі, а таксама сувязь гэтага працэсу з этнаграфіяй.

У Спіс нематыэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЭСКА ад Рэспублікі Беларусь ўнесеныя пяць элементаў, кожны з якіх мае непасрэднае дачыненне да традыцый вясковай культуры:

- беларускі абрад «Калядныя цары»;
- вясенні абрад «Юр'еўскі карагод»;
- урачыстасць у гонар шанавання Іконы Маці Божай Будслаўскай (Будслаўскі фэст);
- культура бортніцтва Беларусі і Польшчы;
- саламапляценне Беларусі: мастацтва, рамяство, уменні [5].

У Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі 166 элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія прама ці ўскосна атаясамляюцца з народнай вясковай культурай [8]. У гэты спіс уваходзяць танцы, практыкі, традыцыі, стравы і г. д. Усё гэта сведчыць пра тое, што у сучасным беларускім грамадстве культурная спадчына Беларусі (перадусім яе нематэрыяльная частка) мае моцнае атаесамленне з народнай вясковай культурай, якая апісваецца праз дэфініцыі «беларуская народная культура», «беларуская традыцыйная культура», «традыцыі беларускай культуры» і г. д. Класічны прыклад – сайт Выканаўчага камітэта СНД, дзе ў 2022 годзе (аб'яўлены Годам народнай творчасці і культурнай спадчыны СНД) было зафіксавана:

> Особенности характера любого этноса находят отражение в его культуре, творчестве и традициях. Беларусь – яркий тому пример. Республика Беларусь имеет богатое культурное и духовное наследие, которое формировалось на протяжении веков и передавалось из поколения в поколение» [6].

Калі звярнуцца да этналагічных акрэсленняў, традыцыйную культуру беларусаў ці народную вясковую культуру разумеюць як тую, «якая характарызуецца найбольшым кансерватызмам і гістарычнай устойлівасцю (народная кулінарыя, дойлідства, абрадавасць, фальклор і інш.)» [11, с. 17]. «Вельмі істотным з'яўляецца даследаванне культуры беларускай этнічнай супольнасці, таму што менавіта яна – этнічная аснова беларускай дзяржавы» [21, с. 3], і «менавіта гэтая традыцыйная «нізкая» сялянская культура стала асноўным прадметам вывучэння этнолагаў ва Усходняй Еўропе, у тым ліку ў Беларусі» [21, с. 10].

Гаворка ідзе пра комплекс вясковай культуры беларусаў другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя. Чаму менавіта гэты перыяд? Па-першае, таму, што як раз у гэты час адбылося шырокае грамадскае (перадусім сярод інтэлектуалаў Расійскай імперыі) усведамленне існавання асобнага беларускага народа на падставе менавіта вясковай супольнасці – так званыя «сялянскія народы». Прычым, гэтае ўсведамленне не залежала ад палітычных і інтэлектуальных пазіцый (заходнерусізм, польскасць, краёвасць, ліцвінства, крывіцтва). Так ці інакш, усе зразумелі наяўнасць культурнай (этнічнай) своеасаблівасці беларусаў. Па-другое, менавіта ў гэты перыяд значная колькасць этнографаў зафіксавала вялікую колькасць этнаграфічных апісанняў і палявых матэрыялаў пра розныя бакі жыцця беларускага вясковага насельніцтва. Прычым гэтыя апісанні дасюль разглядаюцца і ўспрымаюцца (нярэдка абсалютна некрытычна) як гістарычныя крыніцы палявога этнаграфічнага матэрыяла. Па-трэцяе, менавіта ў гэты час на падставе так званых «сялянскіх» народаў пачаўся пра-

цэс нацыябудавання ва ўсім рэгіёне Ўсходняй і Цэнтральнай Еўропы, таму этнаграфічныя апісанні сялянскай культуры сталі найактуальнейшымі і выкарыстоўваліся палітычнымі інстытуцыямі ды інтэлектуаламі для выпрацоўкі канцэпцый і стратэгічных праграм развіцця рэгіёнаў і краін [15, с. 243–347].

У XIX і амаль ва ўсім XX стагоддзі ў Беларусі (я буду называць менавіта так, разумечыючы беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі, БССР, БНР і г. д.) панаваў прымардыялісцкі падыход да нацыі як аб'ектыўна існуючай групы, аб'яднанай агульнай гісторыяй, якая жыве на канкрэтнай тэрыторыі. Гэта адразу зрабіла гістарычны фактар адным з найважнейшых у нашым нацыятворчым працэсе. Тым не менш, пытанне аб тым, што лічыць сваёй гісторыяй, вызывае ў Беларусі вострыя дыскусіі нават цяпер. Існуюць розныя погляды, падыходы і канцэпцыі, адкуль весці адлік, хто «наш», а хто не, і г. д. Гэтыя дыскусіі зараз вядуцца рознымі палітычнымі і інтэлектуальнымі групамі ўнутры беларускага грамадства праз прызму гістарычнай палітыкі як Беларусі, так і суседніх краін. Разумеючы ўсю расплыўчатасць вызначэнняў, можна ўмоўна казаць аб існаванні «нацыянальнай візіі гісторыі Беларусі» (М. Біч, П. Лойка, А. Краўцэвіч і інш.), беларускай дзяржаўнай гістарычнай канцэпцыі (В. Даніловіч, І. Марзалюк, В. Гігін і інш.). Шмат у чым яны «тэлеалагічна» супадаюць, але крытыкуюцца «аб'ектывісцкай» (А. Казакоў, А. Любы, А. Пашкевіч) канцэпцыяй. Цалкам зразумела, што канцэпцыі гісторыі Беларусі зараз моцна залежаць ад палітычных поглядаў, таму нацыянальная канцэпцыя беларусаў як нацыі на падставе прымардыяльных ідэй становіцца палітычна ангажаванай.

Паралельна з гістарычнымі канцэпцыямі неверагодна значным фактарам беларускага нацыятварэння стала сама беларуская вясковая культура. Польская даследчыца Х. Глагоўска даволі жорстка адзначыла, што «родная культура (то бок, беларуская, – *аўт.*) была ўжо з канца XVII стагоддзя зведзена да ўзроўню фальклора» [24, с. 11]. Таму ў другой палове XIX і пачатку XX стагоддзя, дзякуючы актыўнай дзейнасці шэрагу этнографаў, фалькларыстаў і лінгвістаў, была навукова даказана, а затым шырока распаўсюджана ў адукаваных колах ідэя (а потым і факт) існавання асобнага беларускага народа са своеасаблівай устойлівай культурай (мова, матэрыяльныя элементы, духоўная традыцыя і сацыяльныя практыкі):

> К счастью для белорусов, все эти опыты имели здесь влияние больше на высшее сословие, чем на остальную народную массу, бережно сохранявшую все свои отличительные черты и особенности. Эти особенности и могли служить залогом для будущего широкого развития временно подавленной народности, в которой, рано или поздно, должно было пробудиться народное самосознание» [7, с. 169].

Падмуркам такога «шырокага развіцця» сталі этнаграфічныя матэрыялы аб беларускай сельскай/вясковай культуры. У працах П. Шэйна, Е. Раманава, М. Нікіфароўскага, П. Шпілеўскага, Я. і К. Тышкевічаў, А. Семянтоўскага, Я. Карскага, І. Сербава, У. Дабравольскага і іншых быў сабраны і рэпрэзентаваны этнаграфічны, фальклорны і лінгвістычны матэрыял, які відавочна сведчыў аб існаванні самастойнай, своеасаблівай і стабільнай культуры, якая адрознівалася ад культур суседніх народаў – літоўцаў, латышоў, палякаў, рускіх і украінцаў, і рэтрансліравалася з пакалення ў пакаленне [4].

Ва ўсіх губернскіх выданнях на беларускіх землях у другой палове XIX стагоддзя можна было знайсці і прачытаць этнаграфічны матэрыял пра абрады, практыкі і фальклор беларусаў. Прычым менавіта вясковая культура давала прасцейшы спосаб легітымізацыі іх культурнай «незалежнасці». Гарадская і шляхецкая культуры былі больш складанымі, супярэчлівымі і шматслойнымі, з цяжка-

выразнымі самаідэнтыфікацыямі носьбітаў (польская, літоўская, літвінская, краёвая і г. д.), што не ствarала добрага рэсурса і падмурку для працэса нацыятварэння Беларусі. Хаця трэба адзначыць, што і абаперціся на сялянскую/вясковую культуру не было зусім проста, таму што без усеагульнай адукацыі, шырокараспаўсюджаных СМІ, сваёй арміі ды папкультуры ідэнтыфікацыі вясковых беларусаў былі лакальнымі, узяць хаця б знакамітых «тутэйшых», няўлоўных «паляшукоў», а таксама вялікую колькасць розных «вічынскіх палянаў», «дзятлаўцаў», «сакуноў», «цакуноў», «лапатонаў» і іншых [14]. Тым не менш, ужо ў XIX стагоддзі праз этнаграфічныя працы адукаванае грамадства атрымала галоўны важны месідж: беларускае – гэта сялянскае/вясковае, «народнае», беларускамоўнае, што трэба захоўваць як сапраўднае і аўтэнтычнае; тое, што адрознівае «нас» ад «астатніх».

У Савецкай Беларусі гэта дамінанта вясковай/сялянскай культуры як нацыянальнага фундамента замацуецца камуністычнай ідэалогіяй. Так, у Маніфесце Часовага Рабоча-Сялянскага Савецкага Ўрада Беларусі ад 1 студзеня 1919 года зафіксавана:

> Горацешная пакутная Беларусь, Беларусь рабочых і бедных селян, сперша доўгія вякі свайго жыцьця служыўшая сродкам ля абагаченьня польскаго вяльможнаго панства-памешчыкаў, зломыслых грашаўнікоў-купцоў і ўсялякіх багацеяў-крывасмокаў, а потым захопляная пад уціск расейскаго крывавага самадзяржаўя з яго гэнераламі і самаўладным чыноўніцтвам, адурваная ды абманваная з касцёльных амбоняў ксяндзамі і с царкоўных аўтароў папамі, скутая з ног да галавы ланцугамі няволі, цярпеўшая здзекі і глум і пeражыўшая цяшкая ярмо нямецкаго прыгону, цяперь аслабанняцца ад доўгай вякавой пакуты адважным наступам чырвонае арміі і прычашчаяцца да новаго вольнаго жыцьця, якоя будуяцца на закладзінах камунізму, на фундамэнці міжнароднае злукі працоўнаго люду [12].

Паступовa адбывалася замацаванне беларускай вясковай культуры ў публічнай прасторы. Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што вясковая культура беларусаў пачала папулярызіравацца значна раней. Можна толькі нагадаць першую оперу кампазітара Станіслава Манюшкі Галька, што прагучала ў Вільні яшчэ ў 1848 годзе. Язэп Янушкевіч, пішучы аб Манюшцы, узгадваў словы Уладзіміра Караткевіча:

> Калі беларус слухае оперу «Галька» С. Манюшкі, ён адчувае ў ёй … выразную беларускую песенную аснову. І праўда, вялікі кампазітар нарадзіўся ва Ўбелі пад Мінскам, выхоўваўся на народнай песні, напісаў аперэту «Ідылія» (тэкст да яе склаў адзін з заснавальнікаў беларускай літаратуры В. Дунін-Марцінкевіч), у якой паны гаварылі па-польску, а сяляне па-беларуску. Ён увогуле напісаў на словы Марцінкевіча чатыры творы, і гэта, уласна, пачатак оперы беларускай» (з непаўторнага эсэ «Зямля пад белымі крыламі») [23, с. 34].

Беларуская вясковая/сялянская традыцыйная культура становіцца галоўнай тэмай ці матывуе творчасць Францішка Багушэвіча, Цёткі, Янкі Купалы, Якуба Коласа і іншых. На рубяжы XIX–XX стагоддзяў сялянская культура беларусаў становіцца адзіным вымярэннем «беларускасці» культуры. Газета «Наша Ніва» пастаянна звяртала ўвагу на карані беларускага народа і нацыятворчых працэсаў [17, с. 111–112].

Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 года яшчэ больш узмацнілі «этнаграфічнае» разуменне беларускай культуры. Адсюль – беларусізацыя і этнаграфізацыя. Працы этнографаў і ўласна этнаграфічныя матэрыялы ляглі ў аснову нацыянальных дыскурсаў палітыкаў і палітычных арганізацый. Дзеячы і БНР, і БССР у абгрунтаванні права на дзяржаўнасць беларускай нацыі апелявалі менавіта да іх. Тэрыторыя БНР і БССР вызначалася на падставе «этнічнай тэрыторыі» беларусаў, то бок абапіралася на выкарыстанне бела-



Кадр з фільма «Лясная быль», 1926 г.
Рэжысёр Юрый Тарыч

рускай мовы і культуры ў арэале распаўсюджання менавіта вясковай культуры беларусаў. Так у Трэцяй устаўной грамаце БНР было зафіксавана: «Беларуская Народная Рэспубліка павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічбенную перавагу беларускі народ» [16]. Тое самае выкарыстоўвалася як аргумент для ўзбуйнення БССР у 1924 і 1926 гадах, а таксама далучэння Заходняй Беларусі ў 1939 годзе.

У савецкі перыяд вясковая культура беларусаў набыла легітымізацыю ў ідэалогіі марксізма, у якім пралетарыят і сялянства сталі найважнейшымі класамі грамадства. Шматлікія часопісы і газеты 1920-х гадоў былі насычаны нацыянальнай метафарычнай рыторыкай, што абапіралася на народную вясковую культуру:

> …Беларуская нацыянальнасць у працягу некалькіх сталецьцяў уяўляла сабой выспу, якую ззаходу імкнуліся затапіць польскія хвалі, а з усходу, пазьней, хвалі расійскія. Але не паддаўся беларускі народ, вытрымаў гэты націск і моцна стаіць, захаваўшы свае нацыянальныя і этнаграфічныя асобнасьці; ён мае свой асобны псіхічны склад, свае асобныя гістарычныя традыцыі [18, с. 298].

Цікава, што амаль тую ж метафарычнасць будзе выкарыстоўваць літоўская этнаграфія 1990–2000-х гадоў, кажучы аб літоўцах Беларусі – «літоўскія выспы ў беларускім моры».

У канкурэнтнай барацьбе за падмурак нацыянальнага праекта шляхецкая і мяшчанская культуры пацярпелі паразу ад вясковай культуры беларусаў. Шляхецкая культура стала на доўгія гады «польскай» ці «літоўскай». Першы раз гэта было замацавана ідэямі заходнерусізму, потым – падчас разгрому нацыянальнай гістарычнай школы і этнографаў у ходзе рэпрэсій 1930-х гадоў. Наступным разам – падчас Другой сусветнай вайны, калі ў 1942–1943 гадах у Маскве і Ташкенце гісторыкамі АН СССР была арганізавана дыскусія аб Кіеўскай Русі, страце гістарычнага адзінства ўсходніх славян і іх новага аб'яднання пасля падзелаў Рэчы Паспалітай [22].

Ужо ў 1920 – 1930-я гады былі замацаваны кананічныя вобразы беларускай культуры як сялянскай праз створаныя культурныя інстытуцыі: музеі, тэатры, СМІ, літаратуру, а таксама праз новую папкультуру БССР – песні, вобразы, фільмы. Так, ужо ў першым знятым у БССР фільме Лясная быль галоўныя героі ў традыцыйных вясковых пейзажах апранаюць стэрэатыпныя вясковыя строі з вышыўкай. Падчас аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР выйшла серыя плакатаў, дзе ўкраінцы і беларусы дзякавалі чырвонаармейцам за дапамогу. Менавіта той візуальны вобраз мужчын з вусамі і ў даматканых (як падаецца гледачу) кашулях з вышыўкай



«Песняры», 1980 г.
Фота Яўгена Коктыша

замацаваўся на ўсё XX стагоддзе і нечакана стрэліў у XXI стагоддзі – параўнайце вобразы з плакатаў 1939 года і выгляд бульбаша на бутэльцы гарэлкі «Бульбаш», якая на доўгі час стала неад'емным элементам прэзентаў замежнікам падчас любых паездак!

У другой палове XX стагоддзя прапаганда працягвала актыўна выкарыстоўваць вобразы вясковай культуры беларусаў. Напрыканцы 1960-х – пачатку 1970-х гадоў выйшла цэлая серыя плакатаў, што эксплуатавалі народныя беларускія строі ды вышыўку, якія абсалютна дакладна адсылалі гледача да вобразаў беларускай вясковай культуры: Ад пакалення юнага ўдзячнасць і пашана (М. Т. Гуцыеў, 1968), 50 год гартавалася Савецкая Беларусь (П. П. Лысенка, В. М. Ткачук, 1969), 8 сакавіка 1968 (І. Х. Капелян, А. Рэпін, 1968), З Днём вызвалення, Мінск (І. Х. Капелян, 1970), 50-летие образования СССР (Я. І. Хайрулін, 1972) і іншыя [3].

Цікавым і паказальным прыкладам эксплуатацыі вясковай культуры беларусаў у прапагандысцкіх мэтах стала зацвярджэнне ў 1951 годзе сцягу БССР, у якім быў выкарыстаны народны арнамент. Пасля адраджэння у 1995 годзе гэтага сцяга і стварэння Дня беларускага сцяга актыўна распаўсюджвалася інфармацыя аб тым, што за аснову была ўзята вышыўка сялянкі Матроны Маркевіч з вёскі Клімавічы Сенненскага раёна. Аднак, як высвятлілася, гісторыя арнаменту сцяга аказалася значна складаней [10, с. 14–17]. Арнамент сцяга быў прапанаваны менавіта фальклярыстам М. Кацарам, што дае яшчэ адзін доказ інструментальнага выкарыстання этнаграфіі палітычнымі ўладамі БССР і СССР [19].

Вялікае значэнне мела таксама папулярная музычная культура. Спачатку Дзяржаўны акадэмічны хор БССР (з 1950), потым Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР пад кіраўніцтвам Рыгора Шырмы і Дзяржаўны народны хор БССР (потым Дзяржаўны народны ансамбль песні і танца БССР) пад кіраўніцтвам Г. Цітовіча паспяхова перапрацоўвалі

беларускія народныя песні і выконвалі іх у прафесійнай аранжыроўцы, ствараючы папулярныя матывы і шлягеры, якія выконваліся па радыё ды «ішлі ў народ». Прыкладам такіх двухбаковых апрапрыяцый стаў хіт Бывайце здаровы, жывіце багата, які некаторы час лічыўся народнай песняй, але насамрэч словы былі напісаны А. Русаком, а музыка І. Любанам [20]. Тое самае можна сказаць пра песню Лясная песня (Ой, бярозы ды сосны, партызанскія сёстры) і шмат іншых. Галоўным жа прыкладам музычнай эксплуатацыі, а як вынік і папулярызыцыі, беларускай народнай вясковай культуры стала творчасць ВІА «Песняры». Вобраз і касцюмы ансамбля, яго песні напаўнялі беларускасцю ўвесь СССР і бумерангам вярталіся ў БССР. Так, напрыклад, дзявочае імя Алеся пасля аднайменнай песні назаўсёды стала «беларускім».

Кінематограф таксама аказваў значны ўплыў у стварэнні і замацаванні вобразаў беларускай вясковай традыцыйнай культуры. Фільмы Людзі на балоце (1981) і Белые росы (1983) сабралі шматмільённыя пракаты і сталі папулярнымі ў БССР. Першы стаў фактычнай візуалізацыяй «энцыклапедыі беларускага Палесся», як называлі раман Івана Мележа, а другі адлюстраваў працэс урбанізацыі вясковай культуры.

Нават прамысловае развіццё БССР рабіла ўнёсак ва ўзмацненне нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Знакаміты брэнд трактара «Беларус» стаў сімвалам і стэрэатыпным вобразам злучэння сельскага ладу жыцця і беларускасці!

З’явіўшыяся ў БССР нефармальныя арганізацыі і інстытуцыі – Акадэмічны асяродак (1960–1970-я) [13, с. 145–150], «Майстроўня» (1979–1984) [13, с. 152–154; 1 с. 128–129], «Тутэйшыя» [1, с. 130–136], «Талака» (1985–1990) і іншыя выкарыстоўвалі этнаграфічныя матэрыялы беларускай традыцыйнай культуры, ладзілі экспедыцыі на вёскі, імкнуліся адраджаць народныя святы, выконвалі народныя песні і г. д. Можна казаць аб распаўсюджванні сярод інтэлектуалаў БССР 1970–1980-х гадоў так званага фальклорнага руху, накіраванага на актуалізацыю вясковай культуры беларусаў, яшчэ нават без пераасэнсавання [13, с. 156]. Ідэйна гэты рух падтрымліваўся дзякуючы працы беларускіх этнографаў і фалькларыстаў, якія з 1970 года пачалі выдаваць этнаграфічныя і фальклорныя матэрыялы традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў у серыі «Беларуская народная творчасць». Дарэчы, першы том быў прысвечаны беларускім савецкім песням [2]. А ўсяго выйшла болей за 60 тамоў этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў!

Таксама трэба адзначыць асветніцкую ролю раённых гісторыка-краязнаўчых музеяў, экспазіцыя якіх традыцыйна мела этнаграфічныя аддзелы. Праз супрацу са школьнікамі яны шліфавалі вобразы беларускай нацыі і культуры. Як правіла, у экспазіцыях паказваўся ўнутраны выгляд нейкай «тыповай» хаты, абавязкова стаялі глечыкі, калыскі, калаўроты, у адным куце была печ, у другім – «чырвоны кут» з іконай, рушніком, вакном і сталом. Абавязковым элементам быў комплекс жаночага адзення (мужчынскі – значна радзей).

З 1957 года пачаў дзейнасць адмысловы Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Факт існавання асобнага акадэмічнага інстытута легітымізаваў беларускую вясковую культуру яшчэ мацней, надаваў ёй важны «акадэмічны» статус, у складаныя часы вонкавай русіфікацыі і дэбеларусізацыі надзяляў яе сімвалічным капіталам.

Фактычна з канца існавання БССР у грамадстве паўстаў вобраз беларускай вясковай культуры, які прэзентаваўся як унікальны і аўтэнтычны, але пры гэтым з’яўляўся гамагенным і спрошчаным.

Пасля здабыцця незалежнасці беларускае грамадства атрымала спачатку ідэалагічны вакуум. Існуючыя з савецкіх часоў стэрэаты-

пы, сімвалы і вобразы маглі стаць адным з апірышчаў, якое дазваляла б пераадолець гэтую постсавецкую траўму. Асабліва гэта стала актуальным пасля прэзідэнскіх выбараў 1994 года і паварота да «новых старых» каштоўнасцей. Калгасы, дранікі, вобразы беларускага селяніна на бутэльцы водкі «Бульбаш», дзяржаўныя святы і мерапрыемствы кшталту «Дажынак» і «Александрыі, якая збірае сяброў», «Купалля» і іншыя пачалі актыўна і нават агрэсіўна эксплуатаваць вобразы вясковай культуры.

Фактычна можна было назіраць працэс перавынаходніцтва традыцый. Менавіта у XXI стагоддзі беларуская этналогія прапанавала новы тэрмін і канцэпцыю беларускай традыцыйнай культуры. Вобраз і сімвал «традыцый» апанаваў СМІ і палітычны дыскурс. Наратыў традыцыйнай культуры беларусаў стаў інтуітыўнай ідэалагемай, якая сшывала беларускае грамадства, якое ўжо мела іншыя палітычныя, гістарычныя і культурныя размежаванні. Стварэнне музея-скансэна у Строчыцах, музея-запаведніка ў Заслаўі, прыватнага музея ў Дудутках, этнаграфічнай вёскі ў Магілёве толькі узмацнілі гэтыя працэсы. Беларусь выкарыстала магчымасці міжнароднай рэпрэзентацыі ўласнай культуры праз Спісы ЮНЭСКА (у тым ліку традыцыйнай культуры ў Спісе нематэрыяльнай спадчыны), і падняла грамадскую каштоўнасць вясковай культуры для ўнутранага спажывання. Была замацаваная сувязь паміж нацыянальнай ідэнтычнасцю і традыцыйнай культурай беларусаў, што найбольш яскрава рэалізавана праз так званы феномен «вышыванак».

Такім чынам, канцэпцыя «беларускай традыцыйнай культуры» мае шчыльнае дачыненне да нацыятворчых працэсаў. Узнікаючы ў XIX стагоддзі у кантэксце прымардыялісцкіх установак, у другой палове XX і пачатку XXI стагоддзя яна стала адным са складнікаў канструктывісцкіх працэсаў. Да Другой сусветнай вайны гэты праект «беларускасці» як сялянскай вясковай культуры толькі замацоўваўся праз беларусізацыю, мову і беларускія творы. Беларусь і беларусы паступова сталі атаясамляцца менавіта з сялянамі і іх культурай.

Пасля вайны у межах мадэрнізацыі і урбанізацыі, стварэння савецкага грамадства менавіта вясковая традыцыйная культура беларусаў паступова набывала кананічны выгляд, які канчаткова усталяваўся дзесьці ў 1980–2000 гадах. Значная роля ў гэтым належыць музейным экспазіцыям, этнаграфіі і турыстычнай сферы, якія адрэагавалі на ўнутраны попыт беларускага грамадства.

Можна з упэўненасцю казаць аб тым, што такі доўгі працэс выкарыстання і асэнсавання беларускай традыцыйнай культуры ў XXI стагоддзі скончыўся легалізацыяй яе як культурнай спадчыны. Гэта прыклад паспяховага канструявання вялікага канцэпта культурнай спадчыны Беларусі. І гэты працэс яшчэ не скончаны.

### Выкарыстаная літаратура

[1] Астроўская, Т. Культура і супраціў. Інтэлігенцыя, іншадумства і самвыдат у савецкай Беларусі (1968–1988). Беласток: Праваабаронча цэнтр Вясна, 2022. 278 с.

[2] Аўдзяюк, А. «Беларуская народная творчасць» 1970–2007. Бібліяграфія (з алфавітным і храналагічным скарочанымі спісамі і поўным храналагічным спісам з анатацыямі). 2016 // https://www.academia.edu/27572663 (21.07.2023).

[3] Беларускі плакат. Дзяржаўныя святы і падзеі // https://plakat.unid.by/kategoriya/dzyarzhaunyya-svyaty-i-padzei?page=12 (21.07.2023).

[4] Беларусы: У 8 т. Т. 3: Гісторыя этналагічнага вывучэння. Мінск, 1999. 365 с.
[5] Всемирное наследие ЮНЕСКО в Беларуси // https://www.belarus.by/ru/travel/heritage (21.07.2023).
[6] Год народного творчества и культурного наследия СНГ: белорусские народные ремесла, обряды и традиции // https://cis.minsk.by/news/22966/god_narodnogo_tvorchestva_i_kulturnogo_nasledija_sng_belorusskie_narodnye_remesla_obrjady_i_tradicii (21.07.2023).
[7] Гомон. Белорусское социально-революционное обозрение. № 1. Люты–сакавік 1884 г. // Гісторыя Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. у дакументах і матэрыялах. Хрэстаматыя / уклад., навуковы рэдактар А. Ф. Смалянчук. Вільня: ЕГУ, 2007. 302 с.
[8] Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь // http://gosspisok.gov.by/Home/Index (21.07.2023).
[9] Куль-Сяльвестрава, С. Да праблемы фарміравання тэрміналагічнага апарату гісторыі культуры Беларусі // Гістарычны альманах. 2003. Т.9. С. 127–134.
[10] Лабачэўская, В. Патрыятычная міфалогія беларускага арнаменту прафесара М. С. Кацара // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні. Зборнік навуковых прац. Вып. 8. Мінск, 2021. С. 9–44.
[11] Лобач, У. А. Этнаграфія Беларусі: Вучэбна-метадычны комплекс. Наваполацк: ПДУ, 2006. 328 с.
[12] Маніфест Часовага Рабоча-Сялянскага Савецкага Урада Беларусі. 1 студзеня 1919 г. Смаленск // Гісторыя Беларусі найноўшага часу ў дакументах і матэрыялах. Хрэстаматыя уклад. Ю. Бачышча; нав. рэд. А. Смалянчук. Вільня : ЕГУ, 2008. 366 с.
[13] Нонканфармізм у Беларусі: 1953–1985. Даведнік. Т. 1 / Аўтар-укладальнік Алег Дзярновіч. Мн.: Athenaeum, 2004. 252 с.
[14] Першай, А. Тутэйшасць как тактика культурного сопротивления: о локальности, социальной мобильности и беларусской национальной идентичности // Форум новейшей восточноевропейской истории и культуры – Русское издание. 2012. № 2. С. 251–268.
[15] Радзік, Р. Вытокі сучаснай беларускасці. Беларусы на фоне нацыятворчых працэсаў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе XIX ст. Мінск, 2012. 376 с.
[16] Трэцяя Устаўная грамата Рады Беларускае Народнае Рэспублікі. 25 сакавіка 1918 г. // Гісторыя Беларусі найноўшага часу ў дакументах і матэрыялах. Хрэстаматыя уклад. Ю. Бачышча; нав. рэд. А. Смалянчук. Вільня : ЕГУ, 2008. 366 с.
[17] Унучак, А. «Нашаніўства» і «заходнерусізм»: да пытання ідэйнай барацьбы за беларускую інтэлігенцыю на пачатку XX ст. // Гістарычны альманах. 2006. Т. 12. С. 108–122.
[18] Урачысты акт выпуску слухачоў Менскіх Беларускіх 9-цёх месячных лектарскіх курсаў. Прамова М.М.Пятуховіча // Адраджэньне. Літаратурна-навуковы весьнік Інстытута Беларускае Культуры. 1922. Сш. I. С. 297–299.
[19] Хирш, Ф. Империя наций: Этнографическое знание и формирование Советского Союза. М., 2022. 472 с.
[20] Цішчанка, І. К. Жыццё песні / І. К. Цішчанка ; рэд. Г. І. Цітовіч ; рэц. А. С. Фядосік, Б. С. Смольскі. Мінск: Навука і тэхніка, 1984. 64 с., іл.
[21] Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве: вучэб.-метад.дапам. /Т.А.Навагродскі і інш. Мінск, БДУ, 2009. 335 с.
[22] Юсова, Н.А. Академік Володимир Пічета та генезис концепції давньоруської народності // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 2. Минск : БГУ, 2007. С. 19–32.
[23] Янушкевіч, Я. «Люстэрка эпохі…» // Наша вера (Мінск). 2011. № 2 (56). С. 34–37.
[24] Głogowska, H. Białoruś 1914–1929. Kultura pod presją polityki. Białystok 1996. 213 s.